Источник: "Беларуская думка" - №1, 2017-01-27



# Францыск Скарына і яго эпоха

**Набліжаецца ўнікальны юбілей у культурным жыцці народаў Усходняй Еўропы – 500-годдзе беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. Яго пачынальнік – волат эпохі Адраджэння, дзеяч еўрапейскага маштабу, ураджэнец слаўнага горада Полацка Францыск Скарына. Здзейснены ім духоўны подзвіг увайшоў у аналы не толькі беларускай, усходнеславянскай, але еўрапейскай і сусветнай гісторыі. Зразумеўшы гістарычнае значэнне друкавання кніг для культурнага развіцця Чалавецтва, ён усяго сябе прысвяціў гэтай высакароднай справе і дасягнуў плённых і нават уражальных вынікаў.**



**Міхаіл КАСЦЮК, доктар гістарычных навук, акадэмік**

Дзейнасці Францыска Скарыны на ніве асветніцтва моцна паспрыяла тое, што краіны Заходняй і Цэнтральнай Еўропы ўступілі ў пераходны перыяд ад Сярэднявечча да Новага часу. Тады тут развіваліся і распаўсюджваліся навуковыя веды, адбывалася станаўленне розных напрамкаў мастацтва, нацыянальных моў і літаратур. Усё гэта дапамагала росту свядомасці народаў, распаўсюджванню гуманітарных ведаў свецкага характару. Менавіта гуманістычная атмасфера той эпохі фарміравала выдатных яе прадстаўнікоў, адным з іх і стаў Францыск Скарына – самародак зямлі беларускай, які дасягнуў духоўных вяршынь «выкладам, пільнасцю і працай» *[1, с. 107]*.

Яго прыродныя здольнасці і надзвычай ранняе цягаценне да ведаў абумовілі інтэнсіўнае ўзыходжанне на вяршыні многіх тагачасных навук. Вучоба ў Кракаўскім універсітэце ў спалучэнні з прагай да ўсё больш шырокага і глыбокага пранікнення ў прыродныя і грамадскія з'явы дазволіла зусім маладому чалавеку атрымаць прызнанне ў еўрапейскіх культурных цэнтрах. На працягу 1507–1512 гадоў Францыск Скарына ўдасканальваў там свае веды па гісторыі, праву, філасофіі, прыродазнаўчых навуках, медыцыне і іншых напрамках. Гэта дало магчымасць яму атрымаць, можа быць, у Пражскім універсітэце, вучоную ступень доктара свабодных навук.

Вядома і пра тое, як Францыск Скарына, якому было крыху больш за 20 гадоў, атрымліваў у Падуанскім універсітэце ў 1512 годзе вучоную ступень доктара медыцыны. Аб гэтым сведчаць актавыя запісы ўніверсітэта, у якіх спагадліва гаварылася пра «знакамітага мужа… з Полацка». Адзначалася, што ў час пробнага экзамену па медыцыне ён «на 22 прапанаваныя яму раніцай гэтага дня пытанні… бліскуча адказаў па памяці і адхіліў выказаныя яму пярэчанні: выдатна аргументуючы, ён праявіў сябе найлепшым чынам. У сувязі з гэтым усімі там прысутнымі вучонымі, з агульнай згоды, ён быў ацэнены як падрыхтаваны і варты быць допушчаным да асобага экзамену па медыцыне… Гэты пан Францыск даў таксама, паводле ўстаноўленай формы, прысягу» *[2, с. 67]*.

Можна канстатаваць, што «абароне дактарату» наш далёкі па часе зямляк надаваў адпаведнае значэнне. У эпоху Адраджэння, у час рэнесансавых павеваў, публічных дыспутаў паміж вядомымі прадстаўнікамі розных поглядаў на тыя ці іншыя актуальныя праблемы навуковае прызнанне было важным фактарам *[3, с. 1–43; 4, с. 5]*. Абарона ім у Падуанскім універсітэце ступені доктара медыцыны «даўно стала класічнай у скарыніяне» *[5]*. Вядома, што «Скарына

## ПРА АЎТАРА

**КАСЦЮК Міхаіл Паўлавіч.**

Нарадзіўся ў 1940 годзе ў в. Масцішчы Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці.

Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы (1963), аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР (1969).

Працаваў малодшым, старшым навуковым супрацоўнікам, вучоным сакратаром, намеснікам дырэктара па навуковай працы, у 1988–1999 гадах – дырэктарам Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Доктар гістарычных навук (1980), прафесар (1987), акадэмік НАН Беларусі (1996).

Аўтар больш як 300 навуковых прац, у тым ліку шматлікіх індывідуальных і калектыўных манаграфій.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя Беларусі, у першую чаргу Новага і Навейшага часу.

Источник: "Беларуская думка" - №1, 2017-01-27



меў два дактараты – «навукаў вызваленых» і «навукаў лекарскіх» *[6, с. 117]*.

Але найвышэйшай справай свайго жыцця і ўсёй дзейнасці Францыск Скарына лічыў распаўсюджванне кнігадрукавання з выкарыстаннем кірыліцы і іншых славянскіх адметнасцей. Тут ён выступіў найперш як паслядоўнік кракаўскага друкара Ш. Фіёлы, шмат у чым развіўшы і ўдасканаліўшы яго кнігавыдавецкую практыку *[2, с. 8–9]*.

Ёсць падставы меркаваць, што час з 1512 па 1517 год ім быў выкарыстаны для падрыхтоўкі ўласнай кнігавыдавецкай дзейнасці. Выбранне для гэтага Прагі з'явілася заканамерным – горад быў адным з цэнтраў славянскай культуры, дзе прыхільна ставіліся да такога яе напрамку, як кнігадрукаванне *[7, с. 220]*. Пераклад на старабеларускую мову менавіта «Бібліі» лепш за ўсё адпавядаў ментальнасці і духоўным запатрабаванням розных слаёў насельніцтва тагачаснай Беларусі, «людям посполитым к доброму научению» *[8, с. 37]*.

Характэрна, што пачатак беларускага кнігадрукавання, ажыццёўлены Францыскам Скарынам, быў зроблены на прыватнай аснове. Яму ўдалося атрымаць некаторыя сродкі ад шэрагу беларускіх гараджан, якія валодалі пэўнай маёмасцю, уключаючы нават свайго брата Івана. Потым за братавы даўгі мусіў правесці некалькі месяцаў у турме. Усё гэта сведчыць, што асноўнай рухаючай сілай у беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара быў яго энтузіязм, адданасць выбранай справе, разуменне яе перспектыў, веданне становішча з кнігавыдавецкай дзейнасцю ў Еўропе, жаданне, каб родныя мясціны не адставалі ад еўрапейскага вопыту.

Нягледзячы на шматлікія складанасці і цяжкасці, асабліва матэрыяльнага характару, пачатак кнігавыдавецкай дзейнасці Францыска Скарыны ў Празе быў вельмі плённы. Гэтаму садзейнічала актыўная падрыхтоўчая праца, звязаная са стварэннем друкарні, паглыбленым вывучэннем «Бібліі», яе перакладамі на старабеларускую мову. Надзвычай выніковымі аказаліся 1517–1519 гады. Апошняе пражскае выданне – «Кніга Суддзяў» – выйшла ў самым канцы 1519 года.

У той жа час адчуваецца, што радзіма, Беларусь, Полацк і Полаччына заўсёды былі разам з Францыскам Скарынам. Не выпадкова ў сваёй першай кнізе – «Бібліі



◀ **Францыск Скарына. Літаграфія С. Геруса. 1990 год**

рускай» – ён адразу адзначаў, што паходзіць «з славнаго града Полацька». Як бачна, Скарына не толькі канстатуе назву горада, дзе нарадзіўся, жыў і адкуль пайшоў у вялікую дарогу, але гаворыць аб ім у ацэначным сэнсе, што ён – «слаўны». За такім вызначэннем, несумненна, стаіць багатае і гераічнае мінулае, высакароднасць учынкаў і, нярэдка, трагічнасць лёсаў жыхароў горада. Тут выразна праглядваюцца патрыятычныя адносіны першадрукара да роднай зямлі *[9, с. 134]*.

На мяжы 1519–1520 гадоў Францыск Скарына вяртаецца ў Беларусь, у сталіцу Вялікага Княства Літоўскага – Вільню. Заканчваецца, такім чынам, першы этап яго жыцця і дзейнасці ў Еўропе – самы насычаны, выніковы і неардынарны. Скарына атрымаў універсітэцкую адукацыю, стаў доктарам свабодных навук і доктарам медыцыны, зарэкамендаваў сябе знакамітым прадстаўніком беларускай зямлі. Менавіта ў адным з самых вядомых цэнтраў Еўропы – Чэхіі – Ф. Скарына ажыццявіў выданне першай беларускай і ўсходнеславянскай «Бібліі рускай» і іншых кніг.

Гэтым, як і ўсёй сваёй дзейнасцю, ім быў зроблены важкі ўнёсак у асветніцкую сутнасць эпохі Адраджэння на еўрапейскім узроўні *[10, с. 59–60]*. Як прадстаўнік магутнай на той час дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага, Скарына тым самым

Источник: "Беларуская думка" - №1, 2017-01-27





садзейнічаў уключэнню яе ў еўрапейскія рэнесансавыя працэсы, што тады з'яўлялася вышэйшым дасягненнем сусветнай цывілізацыі.

Пераезд у Вільню меў на мэце працяг гэтай дзейнасці, але непасрэдна на беларускай тэрыторыі. Тут з немалымі цяжкасцямі першадрукару ўдалося выдаць у 1522 годзе «Малую падарожную кніжку» і «Апостал» (1525). Кнігавыдавецкая справа Ф. Скарыны спрыяла развіццю і дэмакратызацыі навуковых ведаў, іх папулярнасці сярод пэўных пластоў беларускага насельніцтва. Яшчэ ў большай ступені гэта адносілася да прапаганды асветы, асабліва ў літаратурнай і іншых мастацкіх формах. Сваёй дзейнасцю Францыск Скарына узбагачаў і культурнае аблічча ВКЛ, у якім беларускія землі адыгрывалі вызначальную ролю.

Кнігадрукаванню ў Еўропе, у тым ліку на беларускіх тэрыторыях, спрыяла распаўсюджанне Магдэбургскага права. Яно з'яўлялася важным і адметным напрамкам эпохі Рэнесансу, які па сваёй сутнасці быў сугучны тым новым павевам у жыцці людзей, што неслі з сабою стварэнне кніг і іх прапаганда. Гэта значна дапаўняла змест і формы каларыту тагачаснага жыцця.

▼ **Друкарскі станок Гутэнберга. На такім друкаваў кнігі Францыск Скарына**



Але рух Вялікага Княства Літоўскага, Польскай дзяржавы, іншых еўрапейскіх краін па шляху Асветніцтва, Адраджэння не быў беспраблемным і паслядоўна паступовым. У розных месцах меліся сілы, што выступалі супраць такой пераважаючай на той час тэндэнцыі. Яны імкнуліся спыніць, а часам і павярнуць яе назад, карыстаючыся самымі рознымі спосабамі і прыёмамі. Гэта адбывалася і на ўсходнеславянскіх тэрыторыях.

У пэўнай ступені такія праявы зазнаў на сабе і Францыск Скарына, калі ажыццяўляў пераезд з Прагі ў Вільню. На польскім адрэзку дарогі, у раёне горада Вроцлава, верагодней за ўсё, былі канфіскаваны кнігі і друкарскае абсталяванне, што ён вёз з сабою *[2, с. 15]*. Гэта стварыла новыя цяжкасці, якія патрэбна было пераадольваць...

Вядома, што ў 1525 годзе, калі ў Германіі палыхаў агонь сялянскай вайны, ён ездзіў туды на сустрэчу з шырокавядомымі дзеячамі Рэфармацыі – заснавальнікам нямецкага пратэстантызму Марцінам Лютэрам і нямецкім гуманістам Філіпам Меланхтанам. Можна меркаваць, што асноўнай падставай для такога неардынарнага спаткання было тое, што адзінай крыніцай веры яны прызнавалі Свяшчэннае пісанне – Біблію, у веданні якой Францыск Скарына быў прызнаным аўтарытэтам.

Знаходзячыся на беларускай тэрыторыі, наш далёкі зямляк звяртаў увагу не толькі на захад у еўрапейскім напрамку, дзе разгортвалася Асветніцтва, дулі вятры эпохі Рэнесансу, набіралі моц пратэстантызм і рэфармацыя, але і на ўсход, у бок Маскоўскай дзяржавы. Маюцца некаторыя падставы для меркавання, што ў другой палове 1520-х гадоў ці ў пачатку 1530-х ён ездзіў у Маскву з мэтаю распаўсюджвання кнігадрукавання. Аднак прывезеныя ім кнігі там былі публічна спалены *[2, с. 16]*.

Нельга не звярнуць увагу на тое, што яго верагодная паездка ў Маскву адбылася ва ўмовах складаных адносін паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай. Гэта быў час пасля пераможнай для ВКЛ Аршанскай бітвы, якая адбылася 8 верасня 1514 года. Яе наступствы, як, дарэчы, і іншыя баталіі, не маглі не ўплываць на ўзаемаадносіны суседзяў. Тым не меней

Источник: "Беларуская думка" - №1, 2017-01-27



беларускі гуманіст і асветнік сваім светапоглядам і дзеяннямі ўзнімаўся вышэй гэтых цяжкасцей, зыходзячы з высакародных перспектыў духоўна-культурнага развіцця народаў.

Але жыццё і дзейнасць на радзіме ў другой палове 1520-х і першай палове 1530-х гадоў аказаліся для Францыска Скарыны складанымі. Маюцца сведчанні, што за беларускага першадрукара заступаліся вышэйшыя службовыя асобы Вялікага Княства Літоўскага і Польскай дзяржавы, але не настолькі, каб дапамагчы яму з жыццёвым уладкаваннем і даць магчымасць працягваць кнігадрукаванне. Знакамітыя і багатыя беларускія магнацкія роды, якім мы цяпер аддаём належнае ў эканамічным развіцці і духоўна-культурным станаўленні нашага краю, аказаліся ў той час у баку ад кнігавыдавецкіх намаганняў Францыска Скарыны. Толькі пазней яны павернуцца да гэтай справы і ацэняць яе.

Матэрыяльныя нястачы, немагчымасць аднавіць і прадоўжыць выдавецкую справу, нават судовыя цяжбы з-за маёмасных праблем вымусілі адправіцца на працу да прускага герцага Альбрэхта ў Кёнігсберг. А ў 1535 годзе Скарына зноў вяртаецца ў Прагу, каб працаваць у каралеўскім садзе, прымяняючы і тут свае энцыклапедычныя веды. Як і перад іншымі садоўнікамі, перад ім ставілася задача, каб гэтая частка каралеўскіх угоддзяў адпавядала лепшым еўрапейскім узорам, што Скарына з поспехам і зрабіў.

Прыведзеныя факты сведчаць аб тым, што пры жыцці Францыск Скарына атрымаў прызнанне больш за межамі радзімы. Тут яно прыйшло пазней: асэнсоўвалася паступова, спачатку яго паслядоўнікамі, а затым усё болей шырокімі коламі грамадскасці.

Цяпер мы выразна ўсведамляем, што Францыск Скарына, як беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, займае ганаровае месца ў шэрагу найбольш вядомых прадстаўнікоў еўрапейскага Рэнесансу *[11, с. 312–319]*. Яго жыццё і дзейнасць, прадбачанне ролі і месца кнігадрукавання ў духоўна-культурным развіцці народаў, выдатныя практычныя здзяйсненні ў гэтым напрамку, патрыятызм у адносінах да роднай зямлі, самаадданасць і самаахвярнасць у сваёй справе ўяўляюць сабою сапраўдны подзвіг у імя будучыні беларускага краю.



◀ **Адноўленая па старажытных тэхналогіях Біблія Францыска Скарыны. Верасень 2014 года**

Уяўляецца, што было б апраўданым, зыходзячы з еўрапейскага маштабу жыцця і дзейнасці Францыска Скарыны, кананізаваць яго па лініі праваслаўнай і каталіцкай канфесій.

Даўно наспела неабходнасць устанавіць дакладнае месца пахавання Францыска Скарыны: верагодней за ўсё яно знаходзіцца ў Празе ці яе ваколіцах. А знайшоўшы магілу нашага вялікага земляка, трэба б было паклапаціцца і перанесці яго прах на радзіму – у Беларусь.

## ЛІТАРАТУРА


1. Галенчанка, Г.Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г.Я. Галенчанка. – Мінск, 1993. – 279 с.
2. Францыск Скарына. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 352 с.
3. Владимиров, П.В. Доктор Франциск Скорина. Его переводы, печатные издания и язык / П.В. Владимиров. – СПб., 1888. – 414 с.
4. Пинский, Л.Е. Реализм эпохи Возрождения / Л.Е. Пинский. – М: Гослитиздат, 1961. – 367 с.
5. Шутава, В.П. Ізноў пра Скарыну ў Падуі: час і кантэкст / В.П. Шутава [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://thepointjournal.com/output/index.php?art_id=341&spr_change=. – Дата доступу: 23.12.2016.
6. Тумаш, В. Скарына ў Падуі / В. Тумаш // Спадчына. – 1996. – № 6. – С. 171–227.
7. Францыск Скарына і яго час: энцыклапедычны даведнік. – Мінск: БелЭн, 1988. – 608 с.
8. Кніга Беларусі. 1517–1917: зводны каталог. – Мінск: БелЭн, 1986. – 616 с.
9. Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X–XIX стагоддзі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск: БелЭн, 1995. – С. 123–137.
10. Конан, У. Адраджэнне / У. Конан // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 1: А – Беліца. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 58–61.
11. Галенчанка, Г. Скарына Францыск / Г. Галенчанка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 6, кн. 1: Пузелі – Усая. – Мінск: БелЭн, 2001. – С. 309–319.